Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-02-17



# «Паспяховая жанчына — гэта паспяховае грамадства»

Вольга ПАЛОМЦАВА,
фота Алены Ермаловіч

**“Калі выхоўваеш мужчыну — выхоўваеш індывідуальнасць, калі выхоўваеш жанчыну — выхоўваеш грамадства”, — такая думка гучала рэфрэнам на міжнароднай навуковай канферэнцыі “Сям’я і жанчына ў сучасным свеце: сацыяльныя і культурныя аспекты”, якую правёў Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі разам з Пасольствам Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь.**

“Нягледзячы на відавочныя адрозненні паміж краінамі, праблемы ў нас агульныя: умацаванне ролі сям’і, спрыянне рэалізацыі жанчынай сваіх творчых магчымасцей, — падкрэсліў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Ірана ў Беларусі Сейед Абдала Хасейні. — І мы павінны вучыцца адзін у аднаго лепшым набыткам у гендарнай палітыцы”. Пра актуальнасць гэтага пытання сведчыць удзел у канферэнцыі старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі, старшыні Беларускага саюза жанчын Надзеі Ермаковай, старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Антаніны Моравай, навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў, якія непасрэдна ўплываюць на прававое поле нашай дзяржавы.

Упершыню ў нашай краіне была здзейснена спроба абгрунтаваць мадэль дзяржаўнай палітыкі і працы грамадскіх інстытутаў, накіраваную на рэалізацыю прынцыпаў роўнасці сацыяльных правоў і магчымасцей мужчын і жанчын.

У межах форуму адбылася прэзентацыя кнігі “Зборнік законаў аб жанчыне і сям’і ў Ісламскай Рэспубліцы Іран” — першага рускамоўнага каменціраванага збору заканадаўчых і нарматыўна-прававых актаў Ірана, што датычаць сямейных адносін і становішча жанчыны ў іранскім грамадстве, удзельнікі высока ацанілі выстаўку жывапісных твораў Махмуда Фаршчыяна, фотавыстаўку, якая адлюстроўвала ўдзел іранскіх жанчын у жыцці краіны (навуцы, культуры, мастацтве, спорце), выстаўку тканых карцін, а таксама стэнд кніг Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі “Сям’я і жанчына ў сучасным свеце”.

***На здымку:** Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь Сейед Абдала Хасейні і намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Цыганаў.*

Вольга Паломцава. “Паспяховая жанчына – гэта паспяховае грамадства”